## Анонс

# Чытаем Дубоўку анлайн

**24 сакавіка а 14-й гадзіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе падвядзенне вынікаў Рэспубліканскага анлайн-конкурса чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», прысвечанага 120-годдзю Уладзіміра ДУБОЎКІ.**

Інфармацыйнымі партнёрамі творчага праекта выступілі часопісы «Маладосць» і «Бярозка». Удзел у конкурсе ўзялі 880 чалавек з усёй Беларусі, а таксама — з-за мяжы. Ініцыятыва Нацыянальнай бібліятэкі і беларускіх літаратурных часопісаў атрымала шырокі водгалас і ў Беларусі, і за яе межамі.

На падвядзенні вынікаў адбудзецца ўзнагароджанне памятнымі прызамі і дыпломамі пераможцаў конкурсу ў розных узроставых катэгорыях, а таксама ў дадатковых намінацыях.

— Праект і нам прынёс толькі станоўчыя эмоцыі, — каментуе саму ідэю конкурсу чытальнікаў вершаў аднаго паэта **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» пісьменнік Аляксей ЧАРОТА.** — Спадзяюся, што такія анлайн-конкурсы адбудуцца і ў сувязі з чытаннем вершаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, чые юбілеі мы будзем святкаваць у 2022 годзе.

**Сяргей ШЫЧКО.**